**250.** Утварыце рознымі спосабамі складаныя назоўнікі і запішыце іх. Растлумачце правапіс.

Хлеб + рэзаць, лес + стэп, плацеж + здольнасць, гук + запіс, лісце + падаць, кіно + сцэнарый, шафа + купэ, генерал + лейтэнант, мароз + устойлівасць, сок + выціскаць, кава + варыць, жыццё + любіць.

## § 42. Правапіс *не (ня)*, *ні* з назоўнікамі

**251.** Запішыце назоўнікі, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням. Ці ўжываюцца гэтыя словы без ***не***?

1. Стан, калі не захоўваецца чысціня, парадак. 2. Няшчасны чалавек, які выклікае спагаду, спачуванне. 3. Выдумка, ілжывае паведамленне. 4. Вялікая рыбалоўная сетка. 5. Адсутнасць звестак, ведаў аб чым-небудзь. 6. Маленькая тонкая заколка для жаночай прычоскі. 7. Маладасведчаны чалавек.

Для даведкі: *небарака, неахайнасць, невад, небыліца, невідзімка, недавучка, невядомасць.*

***невідзі́мка***

● Якое з запісаных вамі слоў з'яўляецца мнагазначным? Утварыце на аснове яго спосабам словаскладання назоўнік. Запішыце з ім сказ.



***Не (ня)*** з назоўнікамі пішацца разам, калі:
- слова не ўжываецца без ***не (ня)***: ***непагадзь, нявольнік***;
- назоўнік з ***не (ня)*** можна замяніць сінонімам без ***не (ня)***: ***неспакой*** *(трывога)*, ***нядоля*** *(бяда)*, ***неадукаванасць*** *(адсутнасць адукаванасці)*.

***Не (ня)*** з назоўнікамі пішацца асобна, калі ў сказе ёсць супрацьпастаўленне ці што-небудзь адмаўляецца: ***Не*** *праўда,* ***а*** *падман.*

***Ні*** з назоўнікамі заўсёды пішацца асобна: ***ні*** *рыба* ***ні*** *мяса.*

**252.** Размяркуйце словазлучэнні па групах: 1) словазлучэнні, у якіх ***не (ня)*** — прыстаўка; 2) словазлучэнні, у якіх ***не (ня)*** — частка кораня. Устаўце патрэбную літару, растлумачце правапіс.



Правообладатель Национальный институт образования

Памылка з-за н..ўважлівасці, спыніцца ў н..рашучасці, н..ахайнасць у справе, старажытны н..кропаль*, н..дакладнасць пры адказе, застацца н..вукам, закінуць н..вад, выказаць н..згоду, н..выразнасць выказвання, н..абгрунтаванасць адказу, н..дарэчнасць прапаноў, салодкі н..ктар, н..бяспечнасць учынкаў.

*нектáр*

**253.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце, дзе трэба, коскі. Растлумачце правапіс ***не (ня)*** з назоўнікамі.

1. *(Не)*дасол на стале, перасол на спіне. 2. *(Не)*чужынка а свая радзінка. 3. *(Не)*сілай а розумам. 4. *(Не)*чалавек родзіць праўду а праўда сама нараджаецца. 5. *(Ня)*годніка глупству вучыць не трэба. 6. *(Не)*піток, *(не)*ядок — невялікі работнік. 7. *(Не)*рыба, што ў рацэ, а рыба, што ў руцэ. 8. *(Не)*штука растраціць — штука назбіраць.

Знайдзіце прыказку, якая вучыць ашчаднасці, беражлівасці. Успомніце іншыя ўстойлівыя выразы на гэту тэму.

**254.** Прачытайце гумарыстычны верш.

### Салодкая лячэбніца

Як толькі за Оршай
Направа павернеш —
Прыедзеш у вёску
Пад назвай Цукерня.
Бабулі ласкавыя
Добра там лечаць
Дзяцей, што цукеркамі
Зубы калечаць.
На сонечным мёдзе
Піроожныя смажаць.

Гузы, сінякі
Тут марожаным мажуць.
Ды хутка ўсе дзеці
Пытаюць трывожна:
— Ізноўку цукеркі?
Не хочам піроожных!
Ні хлеба, ні мяса,
Ні кроплі гарчыцы?
Як цяжка лячыцца —
Цяжэй, чым вучыцца!



*П. Панчанка.*

Знайдзіце ў вершы назоўнікі, пры якіх ужываецца адмоўе ***ні***. Зрабіце вывад пра тое, як пішацца ***ні*** з назоўнікамі.

● Выпішыце з тэксту рэчыўныя назоўнікі, вызначце іх скланенне.

Знайдзіце ў вершы аднакаранёвыя назоўнікі. Падбярыце да іх іншыя роднасныя словы, запішыце іх, абазначце карані.



Правообладатель Национальный институт образования

**255.** Замяніце словазлучэнні назоўнікамі з прыстаўкай ***не- (ня-)***. Запішыце.

1. Адсутнасць увагі. 2. Няшчасны выпадак. 3. Нездаровы стан. 4. Адсутнасць ахвоты. 5. Нелюдзімы чалавек. 6. Непаседлівы чалавек. 7. Адсутнасць прывычкі. 8. Страта прытомнасці. 9. Недахоп цярпення. 10. Чалавек у няволі.

З трыма словамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дайце азначэнне назоўніку як часціне мовы.
2. Чым абумоўлена высокая ўжывальнасць назоўніка ў маўленні?
3. На аснове якіх прымет вылучаюцца адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі?
4. Якія назоўнікі маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку?
5. Што абазначаюць агульныя і ўласныя назоўнікі?
6. У чым адметнасць канкрэтных і абстрактных назоўнікаў?
7. У чым адметнасць зборных і рэчыўных назоўнікаў?
8. Што называецца скланеннем назоўніка?
9. Якія назоўнікі адносяцца да 1, 2 і 3-га скланення?
10. Якія назоўнікі адносяцца да рознаскланяльных?
11. Якімі спосабамі ўтвараюцца назоўнікі?

**256.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу маўлення ён адносіцца? Дайце тэксту загаловак.

Звычайна людзі гавораць: «Бульба — хлеб.. падмога». І гэта праўда. Без бульбы нельга ўявіць ні традыцыйны, ні св..точны стол. За..сёды яна побач з хлеб.. . Бульб.. вараць, п..куць, смажаць, фаршыруюць. А якія сма..ныя і ап..тытныя — толькі што з патэльн.. — дранікі! Сучасныя кулінары могуць прыгатаваць з бульб.. 500 розных страў.

Дзікія родзічы бульбы раслі ў Паўднёвай Амерыцы. Адтуль праз акіян, праз тысячы кіламетраў мараплаўцы Хрыстафора Калумба завезлі бульбу ў Еўропу. На нашу зямлю клубні трапілі дзякуючы Пятру І. З цягам часу чалавек ацаніў харчовыя якасці бульбы, назваў яе «другім хлебам». У засушлівыя гады, калі не


Правообладатель Национальный институт образования

радзіла жыта, іншаземка ратавала людзей ад голаду, ад смерці. Нездарма народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль вельмі слушна сказаў: «Пах бульбы — не проста пах, а водар жыцця» *(Паводле З. Марозава)*.

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце назоўнікі, вызначце іх склон і скланенне.

Знайдзіце ў тэксце складаныя назоўнікі. Вызначце, як яны ўтварыліся.

Знайдзіце ў тэксце выказванні пра бульбу. Каму належаць словы ў першым выпадку? Хто аўтар другога выказвання?

Перакажыце частку тэксту, у якой падаюцца звесткі пра тое, як да нас трапіла бульба.

Якія стравы з бульбы гатуюць у вашай сям'і? Раскажыце сваім сябрам пра такія стравы, выкарыстоўваючы звесткі з першай часткі тэксту.

**257.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Адгадкі запішыце. Пастаўце назоўнікі ў формы роднага, давальнага і меснага склонаў. Растлумачце, ад чаго залежыць правапіс канчаткаў.

Адзін лье,
Другі п'е,
Трэці расце.



Лёгкі, але не падняць,
Сцелецца, як рагожа...
Бераг, лужок і стажок —
Кожны схавацца ў ім можа.

*В. Жуковіч.*





Урадзіўся ён высокі,
Шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён.
Здагадайцеся, хто ён?



Цвіту ўсё лета я,
Жыву звычайна ў жыце,
Нашу хлапечае імя.
Як зваць мяне, скажыце?

Знайдзіце ў загадках рознаскланяльны назоўнік. Праскланяце яго.

**258.** Запішыце словы, якія ўжываюцца, калі называем:

1) маладую істоту — дзіцяня каровы, авечкі, лісы, зубра;
2) памяшканне, дзе друкуюць кнігі; пякуць хлеб; прадаюць кнігі;
3) чалавека, які займаецца перапісваннем чаго-небудзь; капіраваннем; перакладам на іншую мову; пасланы ў разведку.

Растлумачце правапіс суфіксаў назоўнікаў.


Правообладатель Национальный институт образования

**259.** Прачытайце верш. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Зрабіце марфалагічны разбор трох назоўнікаў (на выбар).



**Журавінка**

Журавінка*(яга..інка)*,
Вузенькі лісточ..к,
У маленькай журавін..
Кветка, як званоч..к.
Ружавее журавінк..,
Сонц.. наліваецца,

Ч..рванее, палымнее,
Сок.. набіраецца.
Вельмі любіць журавель
Яга..кі*(кіслінкі)*.
Ну а мы з табой к..сель
Зварым з журавінк.. .

*А. Дзеружынскі.*

**260.** Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып маўлення. Раскажыце па-беларуску аб праблеме, якая закранаецца ў тэксце.

Всё человечество делится на две половины. Одна безумно любит животных и пытается адаптировать их к условиям городской жизни, взять на себя заботу о них. Вторая — безразлична и безучастна к проблемам братьев наших меньших.

Как сделать так, чтобы хорошо было всем? Чтобы одни вместе со своими питомцами не создавали хлопот соседям по площадке, подъезду, улице; другие были более терпимы к животным и их хозяевам, взявшим на себя ответственность за их существование. Давайте подумаем вместе! Ведь страшно представить мир без птиц, кошек, собак, если бы они вдруг исчезли. Он стал бы мрачным, пустынным, холодным, а люди — ещё более жестокими и унылыми. Давайте лучше радоваться — жизни, друг другу, всему живому! *(Из газеты «Друзья животных»)*.

Знайдзіце ў тэксце адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі, запішыце іх беларускія адпаведнікі, размеркаваўшы па двух слупках.

Уявіце, што вы ўдзельнічаеце ў пасяджэнні гуртка аматараў прыроды, якое прысвечана праблемам аховы свойскай жывёлы. Падрыхтуйце паведамленне, у якім вы дасце адказ на пытанне, якое вельмі хвалюе аўтара артыкула. Выкажыце і абгрунтуйце сваю думку ў дачыненні да ўзнятай праблемы: як зрабіць так, каб добра было ўсім — і тым, хто вельмі любіць свойскую жывёлу і стараецца адаптаваць яе да дамашніх умоў жыцця, і тым, хто абыякавы да гэтай праблемы.

**261.** Выканайце тэматычную тэставую работу па раздзеле «Назоўнік».



Правообладатель Национальный институт образования